Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

# РАЗВИТИЕ ФУНДАМЕНТАЛЬНОЙ НАУКИ В БГПУ

*Материалы*
*научно-практической конференции*

*г. Минск, 19 ноября 2015 г.*

Минск 2016

УДК 37.01
ББК 74.58
Р 17

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ

Рецензенты:
*А. В. Торхова*, доктор педагогических наук, профессор, проректор по научной работе БГПУ;
*П. А. Матюш*, кандидат исторических наук, доцент, заведующий научно-исследовательским сектором БГПУ

Р17 **Развитие** фундаментальной науки в БГПУ : материалы науч.-практ. конф., г. Минск, 19 ноября 2015 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск : БГПУ, 2016. – 300 с.
ISBN 978-985-541-232-9.

В сборнике представлены статьи, отражающие основные результаты исследований в рамках заданий по Государственным программам научных исследований на 2011–2015 гг.

This book contains articles that reflect the main results of research in the framework of tasks of the State scientific research programs for 2011–2015.

УДК 37.01
ББК 74.58

ISBN 978-985-541-232-9

© БГПУ, 2016

Научное издание

# РАЗВИТИЕ ФУНДАМЕНТАЛЬНОЙ НАУКИ В БГПУ

*Материалы научно-практической конференции*

*г. Минск, 19 ноября 2015 г.*

*Корректоры* О. П. Андриевич, Н. И. Смолич, О. В. Юхновец
*Компьютерная верстка* А. А. Покало
*Дизайн обложки* А. А. Покало

Подписано в печать 08.04.16. Формат 60x84 1/16. Бумага офсетная. Гарнитура *Таймс*. Печать Riso. Усл. печ. л. 17,44. Уч.-изд. л. 17,24. Тираж 70 экз. Заказ 229.

*Издатель и полиграфическое исполнение:*
*Учреждение образования* «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка».
Свидетельство о государственной регистрации издателя печатных изданий № 1/236 от 24.03.14.
ЛП № 02330/448 от 18.12.13.
Ул. Советская, 18, 220030, Минск.
http://bspu.by/upravleniya-i-podrazdeleniya/uchebno-izdatelskii-centr

10. Карпато-русский календарь Лемко Союза на 1943 г. // Архив внешней политики Российской Федерации. – Фонд 138. ОП. 23. П. 36. Д. 3. Л. 9–11об.
11. Československo-sovětské vztahy v diplomatických jednáních. 1939–1945. Dokumenty: 2 d. / Ed. J. Nemecek [et al.]. – Praha : Statni ustredni archiv, 1998–1999. – Díl 2: červenec 1943 – březen 1945. – 1999. – 663 s.
12. Советский фактор в Восточной Европе, 1944–1953: Документы : в 2 т. / Т. В. Волокитина (отв. ред.) [и др.]. – М. : РОССПЭН, 1999. – Т. 1 : 1944–1948. – 687 с.
13. Svitak, I. Velky skluz. Dobrovolna sovetizace. 1938–1948 / I. Svitak. – Praha : Orbis,1990. – 198 s.
14. Brod, T. Spor kolem Zakarpatska. (1944–1945) / T. Brod // Slovanský přehled. – 1968. – № 4. – S. 340–352.
15. Dokumenty z historie československé politiky. 1939–1943 / Ed. L. Otáhalová, M. Červinková. – Praha: Akademie, 1966. – Sv. 1. Vztahy mezinárodní diplomacie k politice československé emigrace na západě. – S.1–412.
16. Kaplan, K. Pravda o Československu. 1945–1948 / K. Kaplan. – Praha : Panorama, 1990. – 248 s.
17. Документы и материалы по истории советско-чехословацких отношений : в 5 т. / подгот. Ч. Аморт, А. Х. Клеванский, А. И. Недорезов [и др.]. – М. : Наука, 1973–1981. – Т. 4. – Кн. 2 : Декабрь 1943 г. – май 1945 г. – 1983. – 472 с.
18. ČSR a SSSR. 1945–1948 : Dokumenty mezivládních jednáních / ed. K. Kaplan, A. Spiritova. – Brno : Doplněk, 1997. – 540 s.



*УДК 94(476) «18»:63*

## ЗМЕНЫ Ў ПАНСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX ст. І ПЕРШЫЯ ПРАЕКТЫ ПАМЕШЧЫКАЎ КРАЮ АБ ВЫЗВАЛЕННІ СЯЛЯН

*А. Ф. Рацько*

## CHANGES IN LANDLORDS' HOUSEHOLD OF BELARUS OF THE SECOND HALF OF XIX CENTURY AND THE FIRST PROJECTS OF THE LOCAL LANDLORDS ON LIBERATION OF PEASANTS

*A. Ratsko*

Даследуюцца фактары і шляхі развіцця памешчыцкай гаспадаркі Беларусі ў перадрэформенны перыяд. Галоўная ўвага надаецца буйным і сярэднім дваранскім гаспадаркам, якія валодалі найбольшым патэнцыялам для адаптацыі да ўмоў рынку. Адзначаецца, што панская гаспадарка, перш за ўсё заходніх і цэнтральных губерняў, паступова ўцягвалася ў таварна-грашовыя адносіны. Робіцца выснова, што беларускія памешчыкі, гаспадаркі якіх ужо станавіліся на новы капіталістычны шлях развіцця, усё часцей выступаюць з прапановамі аб ліквідацыі прыгоннага права, але без надзялення сялян зямлёй.

The article considers the factors and ways of development of landlords' household of Belarus in the period before reforms. The main attention is given to large and average households that possessed the highest potential for adaptation to the market conditions. It has been marked that landlords' household, especially of the western and central provinces, was gradually involved into finance. It is concluded that Belarusian landlords, whose households were moving to the capitalistic way of developing, more frequently come out for elimination of serfdom but without giving land to peasants.

Да часу адмены прыгоннага права на беларускіх землях непадзельна панавала памешчыцкае землеўладанне. Па звестках рэдакцыйных камісій, у 1861 г. памешчыкам пяці заходніх губерняў належала 16071,1 тыс. дзес. зямлі, ці 66,8 % зямельнай плошчы. У цэлым па еўрапейскай частцы Расіі ўдзельная вага памешчыцкага землеўладання была значна ніжэйшая – 24,7 % [23, с. 67]. Эканамічнай асаблівасцю беларускіх земляў у параўнанні з карэннымі расійскімі губернямі была здача ў арэнду сваіх маёнткаў. Арэнда з'яўлялася адным з самых распаўсюджаных відаў дваранскага прадпрымальніцтва. Як правіла сродкі, назапашаныя дзякуючы арэндзе, ішлі на набыццё зямлі [26, с. 206, 209]. У канцы 50-х гг. XIX ст. 53 % усіх сялян пяці заходніх губерняў належалі памешчыкам [28, с. 115].

Дзяржаўныя землі ў Беларусі складалі 18 % агульнай зямельнай плошчы. Значная частка казённай зямлі таксама аддавалася ў арэнду, заклад, кіраванне свецкім і духоўным феадалам [16, с. 70].

Ужо ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. у жыццёвы ўклад пачынаюць пранікаць новыя капіталістычныя адносіны. Гэта праяўляецца пераважна ў сельскай гаспадарцы, а найперш у гаспадарцы памешчыкаў. Менавіта там

былі сканцэнтраваны асноўныя фінансавыя, сыравінныя і працоўныя рэсурсы. Ужо ў гэты перыяд асобныя беларускія маёнткі сталі месцам праяўлення эканамічнай ініцыятывы і імкнення гаспадарыць па-новаму.

Як і ў суседняй Польшчы, а таксама прыбалтыйскіх губернях, на беларускіх землях ў другой палове XIX ст. захоўваліся і ўстойліва развіваліся буйныя і сярэднія памешчыцкія гаспадаркі. Растучы попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю ў краінах Заходняй Еўропы і пашырэнне ўнутранага рынку выклікалі паступовы пераход ад замкнёнай натуральнай гаспадаркі да таварна-грашовай. Таварызацыя захапіла галоўным чынам гаспадарку буйных памешчыкаў заходніх і цэнтральных губерняў.

Земляробства складала аснову эканомікі Беларусі першай паловы XIX ст. Прыярытэтным з'яўлялася вытворчасць збожжа, у першую чаргу жыта. Другой па значнасці культурай быў авёс, трэцяе месца па зборах займаў ячмень. Пачынаючы з першай трэці XIX ст. у памешчыцкай гаспадарцы Беларусі адной з найбольш важных сельскагаспадарчых культур стала бульба. На малаплодных глебах Беларусі бульба давала адносна вялікія ўраджаі, якія ў сваёй масе пераўзыходзілі зборы зерня ў некалькі разоў. Як тэхнічная сыравіна для вінакурства, бульба прыносіла вялікія прыбыткі памешчыкам. Дзесяціна, засаджаная гэтай культурай, пры перапрацоўцы яе на гарэлку давала прыкладна ў 4 разы больш даходу, чым тая ж дзесяціна, засеяная жытам [26, с. 162–163]. З развіццём рынкавых адносін пашыраюцца пасевы тэхнічных культур – ільну, канапель, цукровых буракоў. Шэраг памешчыкаў пачаў вопыты па вырошчванню тытуню.

Важнейшым фактарам развіцця земляробства з'яўлялася жывёлагадоўля. Ад узроўню развіцця жывёлагадоўлі напрамую залежала ўраджайнасць палёў, а таксама наяўнасць цяглавай сілы. У сваёй большасці панскія палеткі апрацоўваліся сялянскай жывёлай. Таму фальваркавае жывёлаводства, у параўнанні з сялянскім, мела лепшыя ўмовы для пераўтварэння яго ў таварную галіну гаспадаркі. У моцных памешчыцкіх гаспадарках заводзілі пародзістых кароў, якіх прывозілі з-за мяжы. Аднак адсутнасць дастатковых рынкаў збыту, цяжкасці ў дастаўцы прадуктаў жывёлагадоўлі на іншыя рынкі стрымлівала развіццё гэтай галіны гаспадаркі. Выключэннем з'явілася тонкарунная авечкагадоўля. Займаліся ёю толькі ў памешчыцкай гаспадарцы, так як гэта патрабавала значных грашовых выдаткаў і штучнага травасеяння. Найбольшых памераў пагалоўе танкарунных авечак у Беларусі дасягнула ў сярэдзіне 40-х гг. XIX ст. З падзеннем коштаў на воўну гэтая галіна жывёлагадоўлі хутка прыйшла ў заняпад.

У пачатку 50-х гг. XIX ст. у памешчыцкіх маёнтках Беларусі з'яўляюцца нескладаныя сельскагаспадарчыя машыны – малацілкі, з дапамогай якіх праводзілася малацьба збожжа. У 40-я гг. гэтыя машыны меліся амаль



у кожнага памешчыка. Адной з прычын хуткага распаўсюджання малацілак быў недахоп рабочых рук. Таксама шырока, як і малацілкі, перад рэформай 1861 г. былі распаўсюджаны веялкі і саломарэзкі [16, с.124; 26, с. 240]. Абслугоўванне гэтых машын патрабавала кваліфікаваных работнікаў, якімі маглі быць не прыгонныя сяляне, незацікаўленыя ў выніках сваёй працы, а маючыя пэўныя навыкі батракі. З'яўленне новай тэхнікі сведчыла аб пранікненні ў памешчыцкую гаспадарку капіталістычных адносін. Аднак наяўнасць дармавой прыгоннай працы з'яўлялася перашкодай увядзенню машын.

Тэхнічная рэвалюцыя закранула і вінакурства. З 1796 па 1859 г. вытворчасць вінакурняў у Беларусі ўзрасла больш чым у 3,5 раза [3, с. 108]. Паравыя катлы замянілі стары агнявы спосаб вінакурства і павялічылі на 1/3 выхад спірта. Гэты спосаб вінакурства і новая сыравіна – бульба – прывялі да рэзкага павелічэння колькасці буйных вінакурняў. Як правіла, тут працавалі прыгонныя ў залік паншчыны. Вінакурства падтрымоўвала эканамічнае становішча памешчыцкіх гаспадарак, давала гарантаваную крыніцу пастаяннага даходу. Маючы магчымасць перапрацоўкі асноўнай прадукцыі земляробства – зерня і бульбы, памешчыкі менш залежалі ад хістання рынку [15, с. 84–85].

Трохпольная сістэма заставалася пануючай да самай адмены прыгоннага права. Аднак у некаторых памешчыцкіх гаспадарках паступова ўводзілася чатырохполле і шматполле. Гэтаму спрыяла шырокае распаўсюджанне бульбы, якая выкарыстоўвалася ў вінакурэнні, а таксама пасевы вікі, цімафееўкі і клевера – высокаякасных кармоў для танкарунных авечак, якіх разводзілі на Гародзеншчыне. Ва ўсіх памешчыцкіх гаспадарках, дзе былі пасевы кармавых траў ці значныя пасадкі бульбы, нават у тым выпадку, калі захоўвалася трохполле, яно ўжо губляла свой характар, уласцівы феадальнай эпосе і сведчыла аб з'яўленні рыс капіталізму [26, с. 248].

Пачынаючы з 40-х гг. XIX ст. памешчыкі, маёнткі якіх знаходзіліся каля буйных гарадоў і ў іншых раёнах, асабліва ў Віленскай і Гродзенскай губернях, пачалі пераводзіць сваіх прыгонных з паншчыны на чынш. Гэта рабілася пад ціскам сялянскай масы, якая дабівалася пераводу павіннасцей, па прыкладу дзяржаўных сялян, на чынш. Пры чыншавай сістэме прыбытак з маёнткаў звычайна быў вышэйшым, чым пры паншчыне. Асабліва паскорыліся тэмпы пераводу на чыншавую сістэму ў апошнія, перадрэформенныя гады. Усё больш памешчыкі мелі ў сябе батракоў са сваіх жа прыгонных або вольнанаёмных, рабочую жывёлу (коней, валоў) і інвентар (звычайна палепшаны) – плугі, бараны, веялкі, малацілкі; частка работ у маёнтках выконвалася з дапамогай гэтых батракоў. Іншы раз працу выконвалі вольнанаёмныя рабочыя. Уладальнікі маёнткаў пераконваліся ў большай

эфектыўнасці наёмнай працы як у сельскай гаспадарцы, так і на вотчынных прадпрыемствах, на будаўнічых работах, на нарыхтоўцы лесу і г. д. Адмова ад паншчыны і перавод сялян на чынш, выкарыстанне найму спрыялі інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і павышэнню прадукцыйнасці працы ў панскіх гаспадарках, перш за ўсё Заходняй Беларусі. Зразумела, чаму памешчыкі гэтага рэгіёну ў хуткім часе паставяць пытанне аб ліквідацыі прыгону [25, с. 57].

На працягу ўсяго XIX ст. гаспадаркі беларускіх памешчыкаў не замыкаліся самі ў сабе па прынцыпе «натуральнай гаспадаркі», а тысячамі нітак былі звязаны з рынкам і рынкавымі адносінамі. Зразумела, што ўладальнік імкнуўся не толькі захаваць атрыманую прадукцыю, але і перапрацаваць, утылізаваць яе, арыентуючыся на спажывецкі попыт. Таму арганічнай часткай гаспадарчага сядзібнага комплексу стала тое, што ў тэрміналогіі тых гадоў называлася «сельскай прамысловасцю» [14, с. 93]. Імкненне павялічыць даходы штурхала памешчыкаў да арганізацыі ў сваіх маёнтках розных прамысловых прадпрыемстваў. Яны размяшчаліся ў асноўным у сельскай мясцовасці. Вотчынная прамысловасць выкарыстоўвала практычна бясплатную сыравіну і дармавую рабочую сілу прыгоных сялян. Прамысловыя прадпрыемствы памешчыкаў-прадпрымальнікаў у асноўным спецыялізаваліся на перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, якая выраблялася ў маёнтках. Акрамя вінакурных у маёнтках беларускіх памешчыкаў былі прадпрыемствы тэкстыльныя, палатняныя, шарсцяныя. Перад рэформай у Беларусі мелася значныя на той час металургічная прамысловасць. З'явілася некалькі буйных жалезаапрацоўчых, а таксама шкляныя і сілікатныя заводы. Дрэваапрацоўчая і лесахімічная вытворчасць былі прадстаўлены галоўным чынам лесапільнымі, паташнымі, дзехцярнымі, смалакурнымі і іншымі прадпрыемствамі.

З пашырэннем вотчынных прадпрыемстваў і асабліва пры паступовай замене мануфактуры фабрыкай узнікае ўсё большая патрэба ў сыравіне і прамысловым абсталяванні, а таксама ў збыце прадукцыі. Гэта вяло да змены адносін з прыгоннымі. Уладальнікі прадпрыемстваў, каб павялічыць прадукцыйнасць працы, выкарыстоўваюць сялян у якасці прамысловых рабочых, або ў залік паншчыны ці за асобную плату [4, с. 120].

Асноўным тыпам прадпрыемстваў, якія належалі памешчыкам, былі прыгонныя мануфактуры. Вытворчасць працы на іх была вельмі нізкай, а ўмовы працы жудасныя. У 20–30-я гг. XIX ст. на некаторых вотчынных мануфактурах ручная праца паступова выціскаецца сістэмай машын і механізмаў, з'яўляюцца першыя паравыя рухавікі. У прамысловасці адбываецца так званы прамысловы пераварот – выцісненне ручной працы сістэмай машын і механізмаў, што сведчыла аб якасна новай ступені эвалюцыі



эканомікі. З'яўляюцца фабрыкі. У 1860 г. у Беларусі было 76 прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі і паравымі катламі. Нягледзячы на тое, што на фабрыках працавала ўдвая менш рабочых, чым на мануфактурах, фабрычная прадукцыя па кошце амаль у 1/5 пераўзыходзіла мануфактурную [4, с. 123].

У першай палове XIX ст. у Беларусі з'яўляюцца прадпрыемствы, заснаваныя на вольным найме, якія належалі купцам, мяшчанам і выхадцам з іншых слаёў насельніцтва. Размяшчаліся яны ў гарадах і мястэчках і былі ў асноўным дробныя і сярэднія. Капіталістычныя прадпрыемствы не маглі скласці сур'ёзную канкурэнцыю на рынку вотчынным, бо іх уладальнікі вымушаны былі аплачваць зямельны ўчастак, сыравіну, а таксама рабочую сілу. Большасць вольнанаёмных рабочых складалі прыгонныя, адпушчаныя на заробкі на кароткі тэрмін. У любы момант памешчык мог загадаць ім пакінуць прадпрыемства. Адпушчаныя на кароткі тэрмін прыгонныя работнікі былі не ў стане задаволіць патрэбы развіваючайся прамысловасці. Панаванне паншчыннай сістэмы перашкаджала фарміраванню кадраў кваліфікаваных наёмных рабочых. І хоць колькасць капіталістычных прадпрыемстваў няўхільна павялічвалася, у цэлым у прамысловасці Беларусі напярэдадні адмены прыгону вольнанаёмныя рабочыя складалі толькі 42,5 % усіх рабочых Беларусі [5, с. 494].

Пад уплывам таварна-грашовых адносін у першай палове XIX ст. паглыбляецца спецыялізацыя асобных раёнаў Беларусі. Паўночная частка вызначалася як раён ільнаводства, заходняя – танкаруннай авечкагадоўлі, цэнтральная – раён вырошчвання бульбы. Спецыялізацыя ўказвала на наяўнасць лішкаў спецыфічных тавараў у адным рэгіёне, якія карыстаюцца попытам у другім. Гэта спрыяла развіццю ўнутранага, а таксама знешняга гандлю. Вытворчасць зерневага хлеба, бульбы, ільну, цукровых буракоў мела выразна таварны характар.

Павялічвалася колькасць гарадоў і мястэчак, а разам з тым неземляробчага насельніцтва. З канца XVIII ст. да канца 50-х гг. XIX ст. у Беларусі назіраецца значны рост колькасці гараджан (з 80 да 320 тыс. жыхароў, г. зн. амаль у 4 разы) [20, с. 161–162]. Гэта цягнула за сабой узрастанне патрэбы ў сельскагаспадарчай прадукцыі, дзякуючы чаму гандлёвыя сувязі паміж горадам і вёскай мелі пастаянны характар.

Такім чынам, у другой палове XIX ст. у эканоміцы Беларусі адбываюцца важныя змены: разгортваецца дваранскае прадпрымальніцтва, ідзе паступовы працэс накаплення купецка-мяшчанскага капіталу, адбываецца прамысловы пераварот, расце колькасць гарадскога насельніцтва, усё часцей выкарыстоўваецца вольнанаёмная праца, пашыраецца гандаль. Усё гэта – сведчанне зараджэння новай капіталістычнай сістэмы гаспадарання. Аднак

выходнай базай для развіцця эканомікі краю была сельская гаспадарка і вёска, дзе панавала ў гэты час феадальна-прыгонніцкая сістэма.

У 40–50-я гг. XIX ст. феадальна-прыгонніцкі спосаб вытворчасці аказаўся ў стане крызісу. Павелічэнне паншчынных павіннасцяў у сувязі з ростам таварнасці памешчыцкіх маёнткаў, абеззямельванне сялян вялі да разбурэння сялянскай гаспадаркі, да падзення сельскагаспадарчай вытворчасці. Няўраджаі 1844–1845 гг. і масавая гібель жывёлы (ад ¼ да ½ пагалоўя) падарвалі сельскую гаспадарку Беларусі. Пасевы збожжавых культур і бульбы к канцу 50-х гг. скараціліся на 10,5 і 45 % адпаведна. Ураджайнасць палёў напярэдадні адмены прыгону знізілася на 30 % у параўнанні з пачаткам стагоддзя і была значна ніжэйшай за сярэднюю ў Еўрапейскай Расіі. Сведчаннем заняпаду сельскай гаспадаркі Беларусі ў 50-я гг. і цяжкага становішча сялянства з'яўляўся несупынны рост нядоімак дзяржаўных падаткаў і плацяжоў, а таксама памяншэнне колькасці прыгонных з 1845 па 1857 г. болей чым на 60 тыс. душ мужчынскага полу [13, с. 98].

Даходнасць памешчыцкіх маёнткаў памяншалася. Расла запазычанасць. Каб здабыць сродкі на паляпшэнне сваёй гаспадаркі памешчыкі закладвалі маёнткі і прыгонных. У Віцебскай губерні да 1855 г. знаходзілася ў закладзе 46 %, у Гродзенскай губерні да 1860 г. – 27,8 %, у Мінскай губерні – 26 % усіх маёнткаў. У цэлым па Беларусі ў 1859 г. было закладзена 59,8 % прыгонных сялян [6 с, 17–18; 8, с. 131]. Толькі ў Віцебскай губерні ў 1859 г. з 1628 памешчыцкіх маёнткаў было закладзена і перазакладзена 483 маёнткі; падвергнута за няўплату працэнтаў: у апеку – 27, вопісу – 211, публічнаму продажу – 18, сапраўднаму продажу 17 маёнткаў [2, с. 333].

Дзяржаўныя ўлады галоўную ўвагу ў сваёй палітыцы на тэрыторыі заходніх губерняў сканцэнтравалі на сялянскім пытанні. Гэта было звязана са спробай пошуку палітычнай апоры самадзяржаўя супроць варожа настроеных мясцовых спаланізаваных памешчыкаў. Сялянскае пытанне набыло тут не толькі вострае сацыяльна-эканамічнае, але і палітычнае значэнне. Урад залежаў ад мясцовай шляхты ў справе паўсядзённага нагляду за прыгоннымі сялянамі, падтрымання грамадскага парадку, збору падаткаў і г. д. Аднак, прызнаючы сялян эканамічнай уласнасцю шляхты, улады павялі з ёю барацьбу за «умы и сердца» гэтых людзей, падкрэсліваючы іх «непольскасть», імкнучыся перашкаджаць нават пачатковаму навучанню на польскай мове [12, с. 102].

Крокам царызма насустрач сялянству стала рэформа кіравання дзяржаўнай вёскай, адной з мэт якой было больш рашуча абмежаваць уладу мясцовых арандатараў. Па праекце міністра П. Кісялёва ў выніку люстрацыі (падрабязнага апісання маёнткаў) павіннасці дзяржаўных сялян паменшыліся, зямельныя надзелы павялічыліся. З 1844 г. у дзяржаўнай вёсцы



Беларусі былі ліквідаваны фальваркі, а сяляне з паншчыны пераведзены на аброк. Рэформа дазволіла крыху палепшыць становішча сялян. Шляхецкія арандатары казённых маёнткаў пазбаўляліся вотчыннай паліцыі і суда над сялянамі, гэтая функцыя перайшла ў рукі дзяржаўных чыноўнікў. Гэта было зроблена, каб паслабіць мясцовае дваранства і пайсці на прамы кантакт улады з сялянствам [10, с. 589–590.].

Пасля рэформы ў дзяржаўнай вёсцы наступным крокам царызму, накіраваным на абмежаванне бескантрольнай улады памешчыкаў над сваімі прыгоннымі, было рашэнне аб увядзенні абавязковых інвентароў у заходніх губернях. П. Кісялёў лічыў магчымым перанесці накоплены вопыт у адносінах дзяржаўных сялян на памешчыцкіх. Ён прапанаваў увесці абавязковыя інвентары, якія б абаранялі прыгонных ад канчатковага разарэння. Увядзенне абавязковых інвентароў на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў пачалося вясной 1847 г., суправаджалася іх масавым пераглядам і працягвалася болей чатырох гадоў.

Дваранства Віцебскай і Магілёўскай губерняў усяляк зацягвала падрыхтоўку абавязковых інвентароў. Яно прасіла ўлады падоўжыць тэрмін складання вопісаў сваіх маёнткаў. Атрымаўшы адказ, памешчыкі Віцебскай губерні ў маі 1845 г. звярнуліся да цара з прапановай «даравання сялянам поўнай свабоды». Прыгоннікі прапаноўвалі стварыць спецыяльны камітэт для вызначэння правоў памешчыцкіх сялян і ўладальнікаў. Прапанавалася заключэнне дамоў паміж сялянамі і памешчыкамі. Апошнія мелі права адхіляць сялян ад карыстання зямлёй у выпадку невыканання ўмоў дамовы. Спачатку цар зацікавіўся гэтым праектам, але ў кастрычніку 1847 г. на імя генерал-губернатара Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў П. Дзякава прыйшло распараджэнне з Міністэрства ўнутраных спраў працягваць інвентарную рэформу [19, с. 48–49].

Ініцыятыва віцебскіх памешчыкаў аб адмене прыгону не была першай у гісторыі заходніх губерняў. Гэтае пытанне бярэ свой пачатак яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай. Некаторыя памешчыкі рабілі даволі рашучыя крокі ў вырашэнні сялянскага пытання. Так, у другой палове XVIII ст. у маёнтку Мерач Віленскага павета граф Павел Ксаверый Бжастоўскі правёў кардынальныя рэформы. У 1769 г. ён выдаў Статут, па якім сяляне яго маёнтка абвяшчаліся асабіста вольнымі. У 1786 г. фальварковая зямля была раздадзена сялянам, а адпрацоўкі замененыя на чынш. Былі ўтвораны органы сялянскага самакіравання, сяляне атрымалі права займацца гандлем і рамяством. Стваралася так званая «Паўлаўская рэспубліка», Статут якой быў зацверджаны сеймавай пастановай у 1791 г. [11, с. 210].

Рэформы Бжастоўскага не знайшлі шматлікіх прыхільнікаў. Толькі падканцлер ВКЛ Яўхім Храптовіч у 1770-я гг. стварыў у сваім маёнтку Шчор-

сы ўзорную гаспадарку, у якой працавалі наёмныя работнікі з мясцовых сялян [21, с. 178.]. Сяляне не атрымалі поўнай волі. Былі знішчаны падданства, паншчына і ўсе паслугі (акрамя талок, старажоўства, падводнай павіннасці і падаткаў) на карысць памешчыка. У канцы XVIII ст. лічылася, што сутнасць вырашэння сялянскага пытання не столькі ў асабістай волі сялян, колькі ў рэгуляванні іх адносін з памешчыкам і нават у добразычлівай апецы над сялянамі [9, с. 31].

Калі Канстытуцыя 3 мая 1791 г. толькі заявіла пра неабходнасць клапаціцца аб сялянах, то напрыканцы паўстання Т. Касцюшкі Вярхоўны нацыянальны савет прыняў распрацаваны Г. Калантаем закон аб распрыгоньванні часткі сялян. Удзельнікам паўстання – салдатам, а пасля іх смерці на полі бою – іх сынам – была абяцана перадача ва ўласнасць нацыяналізаваных і канфіскаваных у здраднікаў зямель [1, с. 306–308].

З уваходжаннем Беларусі ў склад Расійскай імперыі царскі ўрад і памешчыкі неаднаразова ставілі пытанне аб вызваленні сялянства. Спробай палепшыць лёс прыгонных выглядаў Указ аб вольных хлебапашцах ад 20 лютага 1803 г., які даваў права памешчыкам вызваляць сялян паасобку ці цэлымі вёскамі з абавязковым надзяленнем зямлёй. Але ні адзін з памешчыкаў беларускіх губерняў не выкарыстаў права на вызваленне сваіх сялян. Толькі 57 рэвізскіх душ вёскі Жарцы Полацкага павета былі выкуплены казной як прызнанне іх заслуг у гады вайны 1812 г. [7, с. 265–266]. У 1807 г. павятовы маршалак беластоцкага дваранства В. Грондзкі стаў ініцыятарам прашэння да ўлад аб адмене прыгоннага права [30, с. 28].

Пасля вызвалення ад прыгону сялян Эстляндыі ў 1816 г. і Курляндыі ў 1817 г. шляхта Віленскай губерні падчас губернскіх выбараў 1817 г. падымае пытанне аб неабходнасці вызвалення сялян. Маршалак дваранства Упіцкага павета Д. Завіша рашуча патрабаваў вызвалення сялян, але без зямлі. Супроць гэтай прапановы выступіў дэпутат ад Ашмянскага павета Пашкоўскі [8, с. 63–68; 24, с. 7]. Адзінагалоснай падтрымкі прапанова Д. Завішы не атрымала, аднак гэтая ініцыятыва віленскага дваранства была заўважана ў Пецярбургу. Аляксандр І перадаў праз генерал-губернатара А. Рымскага-Корсакава строгае папярэджанне мясцоваму дваранству, так як яно парушыла закон [29, с. 106–113].

На Гродзенскім сойме ў студзені 1818 г. за сялянскую рэформу выказаўся навагародскі дэлегат граф В. Путткамер. У гэтым жа годзе пытанне аб вызваленні сялян падымала мінская шляхта. За ліквідацыю прыгону выказаўся маршалак Грыневіч [30, s. 24–25, 30–32].

Вялікае ўздзеянне як на сялян, так і на памешчыкаў, аказала паўстанне ў Галіцыі і рэвалюцыі ў краінах Еўропы. Паўстанне ў Галіцыі праходзіла пад лозунгам адмены прыгоннай залежнасці, размеркавання памешчыцкай



зямлі паміж сялянамі. Чуткі пра паўстанне хутка пранікі ў пагранічныя губерні Беларусі і Літвы. Пад ціскам сялянскага руху памешчыкі Віленскай і Гродзенскай губерняў прапанавалі ўраду праект вызвалення сваіх сялян. У канцы мая 1846 г. на дваранскіх выбарах частка памешчыкаў Віленскай губерні пад уражаннем падзей у Галіцыі пачала абмяркоўваць гэтую праблему. Аднак губернскае кіраўніцтва спыніла далейшыя дзеянні ў гэтым кірунку [26, с. 439].

Па словах генерал-губернатара Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў Ф. Міркавіча, некаторыя памешчыкі Гродзенскай і Ковенскай губерняў збіраліся падчас дваранскіх выбараў звярнуцца да цара з просьбай вызваліць памешчыцкіх сялян. Ф. Міркавіч тлумачыў такі намер памешчыкаў жаданнем задобрыць сялян, добра ведаючы, што ўрад не пагодзіцца на такую прапанову. Сялянскі рух у Заходняй Беларусі і Літве не быў яшчэ настолькі моцным, каб прымусіць урад пайсці на адмену прыгону. Ф. Міркавіч не дазволіў далейшае абмеркаванне пытання аб вызваленні сялян [27, с. 146].

У некаторых мясцовасцях Беларусі распаўсюджваліся заклікі да паўстання. У 1848 г. з адозвай да сялян выступіў смаргонскі шляхціц Ю. Бакшанскі. Ён заклікаў сялян аб'яднацца з мяшчанамі, салдатамі і выступіць супроць паноў. «Адозва да смаргонскіх сялян», народжаная галіцыйскімі падзеямі, моцна напалохала ўлады [22, с. 289–290]. З мэтай не дапусціць далейшага распаўсюджвання сялянскага руху на тэрыторыі Беларусі, як і іншых заходніх раёнах Расіі, з вясны 1848 г. былі сканцантраваны вялікія вайсковыя сілы, за насельніцтвам быў устаноўлены пільны адміністрацыйна-паліцэйскі нагляд.

У 1848 г. шляхта Мінскай губерні па ініцыятыве Э. Аскеркі, А. Еленскага і С. Берновіча на дваранскім сходзе ізноў падняла пытанне аб ліквідацыі прыгону, што выклікала адмоўную рэакцыю царскіх улад [29, с. 110]. У тым жа 1848 г. у Сенат была пададзена калектыўная заява шэрагу памешчыкаў ад беларуска-літоўскіх губерняў аб прызнанні іх прыгонных уласна вольнымі, аднак і гэты зварот быў адхілены [17, с. 36]. Нежаданне царызму сур'ёзна разглядаць пытанне аб вызваленні сялян тлумачыцца тымі рэакцыйнымі настроямі, якія склаліся ва ўрадавых колах пасля рэвалюцыйных падзей у Еўропе ў 1848 г. У афіцыйных выданнях з'яўляюцца заклікі аб непарушнасці прыгоннага права. П. Кісялёў выказаўся тады наконт ўнутранай палітыцы наступным чынам: «… пытанне аб сялянах лопнула» [18, с. 189].

Тым не менш занепад памешчыцкай гаспадаркі і настойлівае ўвядзенне ўрадам абавязковых інвентароў сталі прычынай таго, што на чарговым з'ездзе дваранства Віцебскай губерні ў 1850 г. пры абмеркаванні пытання,

якімі сродкамі можна лепш і больш паспяхова «адхіліць пагібельныя вынікі няздольнасці ўласнікаў, якія адбываюцца ў выніку спасцігнуўшых губерні ў мінулыя гады няўраджаі» памешчыкі Дрысенскага і Полацкага паветаў С. Убры, І. Храпавіцкі і Ю. Шчыт прапанавалі адмовіцца ад прыгоннага права над людзьмі і звярнуцца да ўрада з прапановай стварыць камітэт для разгляду гэтага пытання. І хоць пры галасаванні дваранства адхіліла гэтыя прапановы [2, с. 108], сам факт іх з'яўлення быў сведчаннем настойлівага пошуку прыгоннікамі новых метадаў вядзення гаспадаркі, а таксама незадаволення ўвядзеннем абавязковых інвентароў.

Нягледзячы на тое, што інвентары па ўсіх маёнтках Віцебскай і Магілёўскай губернях былі к 1849 г. складзены, урад не адважыўся ўвесці іх у дзеянне з-за перавышэння ў гэтых дакументах фактычна існуючых павіннасцей і баязні сялянскіх хваляванняў.

Нарастаючае абеззямельванне сялян заходніх губерняў, узмацненне феадальнай эксплуатацыі, чуткі аб волі выклікалі з боку прыгонных рэзкія пратэсты. Гэта прымусіла Мікалая І зацвердзіць 22 снежня 1852 г. новыя інвентарныя правілы, якія прадугледжвалі больш сур'ёзныя абмежаванні ў адносінах правоў памешчыкаў на надзельныя сялянскія землі. Аднак новыя правілы выклікалі абурэнне памешчыкаў, якія ўвогуле выступалі супроць умяшання дзяржавы ва ўнутрыпамеснае размеркаванне ўгоддзяў і рэгламентацыю сялянскіх павіннасцей.

У красавіку 1854 г. Мікалай І перадаў «Правілы» 22 снежня 1852 г. на разгляд новага сакрэтнага камітэта, старшынёй якога быў прызначаны наследнік прастола, Аляксандр II. Будучы «вызваліцель» быў супроць любых абмежаванняў праў памешчыкаў у адносінах распараджэння зямлёю. Сакрэтны камітэт прапанаваў губернскім інвентарным камітэтам перагледзець інвентарныя «Правілы» 1852 г., і ўжо праз некалькі месяцаў віленскаму генерал-губернатару І. Бібікаву былі перададзены новыя варыянты інвентарных правілаў. У адрозненне ад іншых, Гродзенскі інвентарны камітэт катэгарычна адмовіўся прызнаваць права сялян на якую-небудзь зямлю, а ў заключнай частцы дакумента прапаноўваў ліквідаваць прыгоннае права ўвогуле. Па праекце Гродзенскага камітэта ўся зямля павінна была застацца ў поўнай уласнасці памешчыкаў. Сялянам давалася права свабоднага перамяшчэння ў межах губерні. Для рэгулявання прававых і гаспадарчых пытанняў паміж памешчыкамі і сялянамі прапаноўвалася стварыць адпаведнае ўпраўленне [26, с. 456]. Генерал-губернатар адхіліў праект Гродзенскага камітэта і распрацаваў свой, у якім былі скасаваны ўсе ўступкі сялянам, што прадугледжваліся «Правіламі» 1852 г.

Інвентарныя правілы 1855 г. замацоўвалі фактычна існуючыя адносіны паміж памешчыкамі і прыгоннымі ў маёнтках, дзе была цяглавая сістэма



(Магілёўская і Віцебская губерні). Складзеныя інвентары павінны былі дзейнічаць з пачатку 1856 г., але памешчыкі сарвалі гэты тэрмін. Што датычыць інвентароў у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях, то тут засталіся інвентары, уведзеныя на падставе закона ад 15 красавіка 1844 г., якія дзейнічалі без зменаў да рэформы 1861 г.

Такім чынам, к сярэдзіне XIX ст. у буйной памешчыцкай гаспадарцы Беларусі адбываюцца істотныя змены. Панская гаспадарка, перш за ўсё заходніх і цэнтральных губерняў, паступова ўцягвалася ў таварна-грашовыя адносіны. Агульнай эканамічнай тэндэнцыяй гаспадарчага жыцця панскіх маёнткаў стала ўсё больш выразная арыентацыя на рынак. Пашыраецца сельскагаспадарчая вытворчасць і яе спецыялізацыя. Экстэнсіўныя метады вядзення гаспадаркі паступова змяняліся інтэнсіўнымі. Некаторыя ўладальнікі пачынаюць ўводзіць змены ў апрацоўку зямлі, ужываючы машыны і механізмы, выкарыстоўваючы наёмную працу. Гэта сведчыла аб пранікненні ў гаспадарку новых капіталістычных адносін. Зразумела, што для такіх уладальнікаў вызваленне сялян было не толькі магчымым, але і пажаданым. «Развязаўшыся» са сваімі прыгоннымі, памешчыкі пазбаўляліся неабходнасці клапаціцца аб адказнасці за ўплату дзяржаўных падаткаў, клопату аб сваіх сялянах падчас голаду і іншых бедстваў. Захаваўшы за сабой зямлю, паны маглі смела глядзець у будучыню. Вопыт суседніх польскіх і прыбалтыйскіх губерняў, дзе ўжо даўно быў ліквідаваны прыгон, падказваў ім «суцяшальную будучыню». Сяляне, атрымаўшы волю, вымушаны будуць ісці да ўладальнікаў наймацца на працу.

Упартае навязванне царызмам абавязковых інвентароў памешчыкам беларуска-літоўскіх губерняў не ў апошнюю чаргу стала прычынай іх ініцыятывы ў вызваленні сялян ад прыгону. Беларускія памешчыкі, гаспадаркі якіх ужо станавіліся на новы капіталістычны шлях развіцця, ва ўмовах пастаяннага ціску з аднаго боку сялянскімі хваляваннямі, а з другога – ненавіснымі абавязковымі інвентарамі, выбралі за лепшае ўвогуле адмовіцца ад прыгону.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак. – М. : Юридическая литература, 1980. – 558 с.
2. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док. и материалов : в 3 т. – Минск: Изд-во АН БССР, 1959–1961. – Т. 3 : Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX в. (1772–1860) / В. В. Чепко [и др.]. – 1961. – 623 с.
3. Болбас, М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1775–1861 гг.) / М. Ф. Болбас. – Минск, 1966. – 268 с.
4. Гісторыя Беларусі: у 6 т / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.] – 2005. – 518 с.

5. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / АН БССР, Ін-т гісторыі; рэдкал. : І. М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 1: Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму – 1972. – 632 с.
6. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал. : І. М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975; рэд. кал. : К. І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. – 1972. – Т. 2 : Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.). – 688 с.
7. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да 1996 г. : у 3 т. / В. І. Мялешка [і інш.]; рэд. В. І. Мялешка. – Мінск : Беларус. навука, – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытных часоў да 1861 г. – 1997. – 431 с.
8. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі : у 4 т. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. – Т. 2 : 1772–1903 / пад рэд. : М. Н. Нікольскага [і інш.]. – 940 с.
9. Довнар-Запольский, М. В. Страница из истории крепостного права в XVIII–XIX вв. / М. В. Довнар-Запольский. – М. : Изд-е Тов-ва И. Д. Сытина, 1906. – 67 с.
10. Дружинин, Н. М. Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселева / Н. М. Дружинин. в 2 т. – Т. 1. Предпосылки и сущность реформы / Н. М. Дружинин. – М-Л : Изд-во Академии Наук СССР, 1946. – 636 с.
11. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт. Воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Минск : БелЭн, 1994. – 550 с.
12. Западные окраины Российской империи. – М. : Новое литературное обозрение, 2006. – 608 с.
13. История Белрусской ССР / АН БССР, Ин-т истории; редкол. : И. М. Игнатенко [и др.] – Минск : Наука и техника, 1977. – 632 с.
14. Кіштымаў, А. Вопросы экономического развития Беларуси и белорусская национальная идея в начале XX в. / А. Кіштымаў. Беларускі гістарычны зборнік – Białoruskie Zeszyty Historyczne. – № 17. – С. 88–118.
15. Кіштымаў, А. Эканамічныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. / А. Кіштымаў // З глыбі вякоў : вып. 2, Мінск 1997. – С. 79–100.
16. Козловский, П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. / П. Г. Козловский. – Минск : Наука и техника, 1982. – 206 с.
17. Колмаков, Н. М. Вопрос о почине крестьянского дела. 20 ноября 1857 г. Исследование по официальным данным / Н. М. Колмаков // Русская старина. – 1885. – Т. 47. – № 7. – С. 125–136.
18. Корнилов, А. А. Курс истории России XIX века / А. А. Корнилов. – М. : Высш. шк., 1993. – 446 с.
19. Лепеш, О. В. Комитет западных губерний : организация и деятельность (1831–1848 гг.) / О. В. Лепеш. – Минск : РИВШ, 2010. – 158 с.
20. Лютый, А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века / А. М. Лютый ; под ред. В. В. Чепко. – Минск : Наука и техника, 1987. – 179 с.
21. Мякотин, В. Крестьянский вопрос в Польше в эпоху ее разделов / В. Мякотин. – СПб. : Тип-я В. В. Комарова, 1889. – 230 с.
22. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / рэдкал. : М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.



23. Панютич, В. П. Помещичье землевладение в Белоруссии во второй половине XIX в. / В. П. Панютич // Проблемы аграрной истории : в 2 ч. / под ред. В. Л. Янина. – Ч. 2. (XIX – 30-е годы XX в.) – Минск : Наука и техника, 1978. – С. 66–77.
24. Станкевич, А. Первые шаги крестьянской реформы в Северо-Западном крае / А. Станкевич. – Вильно, 1911. – 26 с.
25. Улащик, Н. Крепостная деревня Литвы и Западной Белоруссии накануне реформы 1861 г. / Н. Улащик // Вопросы истории. – 1948. – № 12. – С. 51–66.
26. Улащик, Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1965. – 479 с.
27. Федор Яковлевич Миркович. 1789–1866. Его жизнеописание, составленное по собственным его запискам, воспоминаниям близких людей и подлинным документам : в 2 ч. – СПб. : Военная тип., 1889. – Ч. 1. – 317 с.
28. Чепко, В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века / В. В. Чепко. – Минск : Наука и техника, 1966. – 213 с.
29. Шполер, Д. Польское дворянство и крестьянский вопрос в XIX в. // Вопросы истории. – 2008. – № 2. – С. 106–113.
30. Mościcki, H. Sprawa włościańska na Litwie w pierwszej czwerci XIX stułecia / H. Mościcki. – Warzawa : Naklad Gebethnera i Wolffa, 1908. – 38 s.